УДК 7.046.3

Уладзімір Карэлін
Мікалай Мельнікаў

# Рэдкія сюжэты ў іканаграфіі святых у храмах Беларусі

Проаналізовано сюжети сакрального мистецтва Білорусі. Для аналізу вибрано рідкісні ікони, які трапляються в храмах не частіше аніж у трьох випадках. Подано короткі відомості про зображення святих, розглянуто іконографію окремих творів. Основна частина розглянутих ікон датується кінцем XVIII – початком XX століть і відповідає іконографічному канонові, коли святі і мученики представлені кожен окремо, поряд зі своїми атрибутами і знаряддями тортур.

Досліджено рівень впливу західноєвропейського сакрального мистецтва на іконографію Білорусі. Встановлено, що сюжет ікони "Чудо св. Яна з Кенти" автор точно скопіював з твору відомого польського та італійського художника XVIII ст. Тадеуша Кунтце. Обгрунтовано, що частина ікон, хоч і створена під впливом творів західноєвропейського мистецтва, проте відрізняється композиційною своєрідністю. Особливу увагу приділено сюжетам ікон "Архангел Рафаїл і Товія перед Тавітом", "Страждання св. Прокопія", "Св. Бернард". Відзначено незвичайну композицію ікони "Св. Себастьян", де автор зумів передати експресію в образі вмираючого святого.

*Ключові слова:* ікона, святі мученики, іконографія, атрибути

**Vladimir Karelin, Nikolaj Melnikov**

**Rare scenes in the iconography of saints in the churches of Belarus**

The plots of sacral art of Belarus are analyzed. The rare icons that occur in temples not more than in three cases are selected for analysis. Brief descriptions of the depicted saints and the iconography of certain works are considered. The main part of the considered icons dates to the end of the 18th – the beginning of 20th centuries and corresponds to the iconographic canon, when the saints and martyrs were presented each separately with their attributes and instruments of torture.

The level of influence of Western European sacral art on the iconography of Belarus is investigated. It is established that the plot of the icon "The miracle of St. John Cantius" was copied exactly from the work of the famous Polish and Italian painter of the 18th century Tadeusz Kuntze. It is substantiated that some

of the icons, though created under the influence of works of Western European art, yet differ in compositional peculiarity. Special attention is paid to such plots of the icons: "The Archangel Raphael and Tobias in front of Tobit", "The torment of St. Procopius", "St. Bernard". Especially notable is the plot of "St. Sebastian", where the author has created an unusual composition and was able to convey the expression in the image of the dying saint.

*Keywords:* icon, the Holy Martyrs, iconography, attributes

У дадзеным паведамленні, як і ў папярэдніх [1, с. 335; 2, с. 486, 3, с. 152], разглядаюцца асаблівасці іканаграфіі асобных, рэдка сустракаемых на Беларусі абразоў, прыводзяцца іх тэхнічныя дадзеныя і падаюцца кароткія звесткі аб персанажах, згодна літаратурных крыніц [4–7]. Дні шанавання святых прыводзяцца па грыгарыянскаму і юліянскаму календарах.

Свяціцель Павел I Іспаведнік нарадзіўся ў Фесалоніках. У перыяд супрацьборства праваслаўных з арыянамі двойчы (у 337 г. і ў 341 г.) абіраўся канстанцінопальскім патрыярхам і двойчы быў выгнаны са сталіцы, апошні раз у Арменію, дзе ў 350 г. прыняў пакутніцкую смерць – падчас літургіі арыяне задушылі Паўла яго свяціцельскім амафорам. У 381 г. імператар Феадосій Вялікі урачыста перанёс мошчы свяціцеля Паўла ў Канстанцінопаль, а ў 1326 г. мошчы былі перанесены ў Венецыю. Праваслаўная царква адзначае памяць свяціцеля Паўла Іспаведніка 6 лістапада па юліянскім календары. На адзіным абразе, зафіксаваным у храме г. Мінска, прадстаўлена роставая выява свяціцеля ў епіскапскім аблачэнні і з непакрытай галавой (канец XIX – пачатак XX ст., палатно, алей, 250 x 85). Дзвюма рукамі ён трымае на ўзроўні грудзей закрытую кнігу.

Прэпадобны Павел Фівейскі, згодна жыція ад св. Іераніма, нарадзіўся каля 228 г. у Егіпце, у г. Фівы. Ён лічыцца першым пустэльнікам, паколькі падчас ганенняў імператара Дэцыя (249–251) на хрысціян, сыйшоў у пустэльню і пражыў там у пячоры 91 год, праводзячы ўвесь час у малітве. Вопраткай яму служыла лісце пальмы, а ежу прыносіў крумкач. Незадоўга да смерці, калі Паўлу было 113 гадоў, яго наведаў Антоній Вялікі, які і пахаваў



*Іл. 1. Прэпадобны Павел Фівейскі. Вілейскій раён Мінскай вобл. Канец XIX – пачатак XX ст. Дошка, алей*

пустэльніка ў 341 г. Магілу, згодна падання, вырылі два львы, якія разам з крумкачом лічацца атрыбутамі святога. Яго памяць адзначаецаа 15 снежня ў каталікоў і 15 снежня ў праваслаўных (па грыгарыянскім і юліянскім календары адпаведна). Павел Фівейскі прызнаны духоўным апекуном манаскага Ордэна паулінаў, заснаванага ў 1215 г., галоўны манастыр якога знаходзіцца ў Чанстахове. Адзіны абраз з выявай прэпадобнага Паўла *(іл. 1)*



*Іл. 2. Пакутніца Пелагея Тарсійская. Мастоўскі раён Гродзенскай вобл. Пачатак XX ст. Дошка, алей, 16 х 18*

зафіксаваны ў праваслаўным храме ў Вілейскім раёне Мінскай вобл. Святы прадстаўлены пакаленна ў манаскім аблачэнні, з доўгай сівой барадой і непакрытай галавой. Ён бласлаўляе абодвума рукамі.

Пелагея Тарсійская – хрысціянская пакутніца – нарадзілася ў Тарсе (Малая Азія) ў знатнай і багатай сям'і. Яе бацькі былі паганцамі, аднак сама Пелагея, якая вылучалася прыгажосцю і добрай адукацыяй, стала хрысціянкай і таму адхіліла прапановы пайсці да шлюбу як спадчынніка імператара Дыёклетыяна

(284–305 гг.), так і самога імператара. За гэта Пелагея прыняла жорсткія пакуты і была спалена ў разагрэтым медным быку ў 287 (290?) г. Памяць святой адзначаецца 4 траўня і 7 кастрычніка па юліянскім календары. На двух абразах, зафіксаваных у Гродзенскай вобл., прадстаўлена паясная выява св. Пелагеі-пакутніцы *(іл. 2)* ў багатым аблачэнні з каштоўнымі ўпрыгожаннямі на руках і шыі. У паднятай правай руцэ яна трымае крыж, левая прыціснута да грудзей.

Прэпадобная Пелагея Антыёхійская, якая нарадзілася ў Антыёхіі сірыйскай, была вельмі прыгожай і вяла лёгкадумны і распусны вобраз жыцця. Аднак пасля наведвання храма падчас літургіі, Пелагея прыняла хрост, а потым, пераапрануўшыся ў мужчынскае адзенне, пайшла ў Іерусалім і пастрыглася ў манахі. На Елеонскай гары яна зрабіла сабе келлю і вяла там манаскае жыццё, праводзячы ўсе дні ў малітвах і пакаянні, прычым мясцовыя жыхары лічылі яе за інака Пелагія, еўнуха. Праз некалькі гадоў прэпадобная Пелагея памерла (прыкладна ў 457 г.) [8]. Яе памяць шануецца 8 кастрычніка па юліянскім календары. На абразе з Камянецкага раёна Брэсцкай вобл. прадстаўлена паясная выява святой ў манаскім аблачэнні з малітоўна скрыжаванымі на грудзях рукамі. З абодвух бакоў змешчаны надпіс: «Св. преп. Пелагія» *(іл. 3)*.

Святая прэпадобная Платаніда першапачаткова была дыяканісай. Аднак яна пажадала яшчэ больш прысвяціць сябе Хрысту, таму сыйшла ў нізібійскую пустльню (Месапатамія), дзе заснавала абіцель для дзеў. Насельніцы абіцелі вялі аскетычны вобраз жыцця – ежу прымалі толькі адзін раз за дзень, а ўвесь вольны ад малітваў час праводзілі ў працы і рукадзеллі. Сама Платаніда была прыкладам для сёстраў абіцелі ва ўсіх справах да самой смерці, што адбылася каля 308 г. [9] Памяць святой адмячаецца 6 красавіка па юліянскім календары. На адзіным абразе з Віцебскай вобл. *(іл. 4)*, амаль цалкам закрытым абкладам, прадстаўлена паясная выява св. Платаніды з аскетычным тварам і ў аблачэнні дыяканісы. У



*Іл. 3. Прэпадобная Пелагея Антыёхійская. Камянецкі раён Брэсцкай вобл. Канец XIX ст. Палатно, алей*

правай руцэ яна трымае крыжык, левая прыціснута да грудзей. Знізу на раме змешчаны надпіс: «СВ ПРЕП ПЛАТОНИДА». На ківоце абраза знаходзіцца гравіраваная таблічка з тэкстам: «Объ упокоеніи души / усопшия Ф. Б. Платониды / Лукиры Буйко / деревни козаковъ/ 18 дек. 1904 г.».

Свяціцель Піцірым епіскап Тамбоўскі (у міры Пракопій) нарадзіўся 27 лютага 1645 (ці 1644) г. у г. Вязьме. З дзяцін-



*Іл. 4. Прэпадобная Платаніда. Шаркаўшчынскі раён Віцебскай вобл. 1904 г. Дошка, тэмпера, 33 х 24*



*Іл. 5. Свяціцель Піцірым епіскап Тамбоўскі. Жабінкоўскі раён Брэсцкай вобл. Канец XIX ст. Дошка, алей, 43 х 36*

ства ён любіў наведваць храм, а калі падрос, вырашыў цалкам прысвяціць сябе служэнню Богу. Пракопій пайшоў у Вяземскі Яна-Прадцечанскі манастыр, дзе на 21 годзе жыцця быў пастрыжаны ў манахі пад імем Піцірым. У хуткім часе брацція абрала яго ігуменам, а ў 1677 г. Піцірым быў узведзены ў сан архімандрыта. У 1685 г. адбылася хіратонія архімандрыта Піцірыма ў епіскапа Тамбоўскага. Уладыка заўсёды быў даступны для вернікаў, яго свяціцельскімі малітвамі і клопатамі ўладкоўваліся храмы і манастыры, выхоўваліся новыя пакаленні пастыраў. Спачыў епіскап Піцірым 28 ліпеня 1698 г. Рашэннем Свяцейшага Сінода ад 24 *л*іпеня 1914 г. епіскам Піцірым быў далучаны да ліку святых. Яго памяць адмячаецца 28 ліпеня па юліянскім календары. Падчас экспедыцый зафіксаваны тры абразы з выявай свяціцеля Піцірыма з практычна аднолькавай іканаграфіяй, як, напрыклад, на абразе з Брэсцкай вобл. *(іл. 5)*, дзе святы прадстаўлены ў епіскапскім аблачэнні з доўгай сівой барадой і вусамі. Правай рукой ён блаславуляе, у левай трымае посах.

Святы вялікапакутнік Пракопій Кесарыйскі, у міры Неаній, жыў і пацярпеў пры імператары Дыёклетыяне (284–305). Згодна жыція, ён нарадзіўся ў Іерусаліме ў знатнай рымскай сям’і. Яго бацька быў хрысціянінам, аднак рана памёр і маці выхавала Неанія ў паганскай веры. Ён паступіў на вайсковую службу і ў 303 г. быў прызначаны імператарам праконсулам Александрыі з загадам выкараняць хрысціянства. Па дарозе ў Егіпет Неанію адбылося яўленне Ісуса Хрыста, пасля чаго ён зрабіўся абаронцам хрысціянства і стаў змагацца з паганствам. Ён прылюдна парваў пасланне імператара, за што быў схоплены і аддадзены на пакуты, якія стойка пераносіў. Ноччу ў цямніцу з’явіўся Хрыстос з анёламі і пахрысціў Неанія, надаўшы яму імя Пракопій. Пасля жорсткіх пакутаў Пракопій быў асуджаны на адсячэнне галавы мячом. Адбылося гэта 8 ліпеня 303 г. У гэты ж дзень (па юліянскім календары) адзначаецца памяць святога вялікапакутніка [10]. На абразе з Віцебскай вобл. *(іл. 6)* адлюстравана сцэна



*Іл. 6. Вялікапакутнік Пракопій Кесарыйскі. Аршанскі раён, Віцебскай вобл. Пачатак XIX ст. Метал, алей, 36 x 29*



*Іл. 7. Вялікапакутнік Пракопій Кесарыйскі. Мінск. Пачатак XX ст. Дошка, тэмпера, 125 х 60*



*Іл. 8. Арханёл Рафал з Товіем перад Тавітам. Камянецкі раён Брэсцкай вобл. Другая палова XVIII ст. Палатно, алей, 68 х 50*

пакут Пракопія. Святы ў набедранай павязцы падвешаны за рукі на суку дрэва, а двое воінаў дзяруць яго цела жалезнымі кіпцюрамі.

Яшчэ на адным абразе з г. Мінска, амаль цалкам закрытым абкладам, прадстаўлена роставая выява Пракопія ў даспехах вайсковага начальніка. У правай руцэ ён трымае крыж і пальмавую сцябліну, паднятая левая скіравана да нябёсаў *(іл. 7)*.

Арханёл Рафал (дапамога, ацаленне божае), паводле апокрыфаў, лічыцца другім у шэрагу арханёлаў (пасля Міхала). Згодна габрэйскаму мідрашу, Рафал суняў боль у Аўраама пасля таго, як ён зрабіў сабе абразанне. Арханёл Рафал з'яўляецца асноўным анёлам-ахоўнікам, ён ахоўвае людзей ад хваробаў і ранаў, лечыць іх, а таксама апякуецца і спрыяе тым, хто ў дарозе. Яго ўшаноўваюць як апекуна аптэкараў, хворых, медыкаў, эмігрантаў, пілігрымаў, бежанцаў. Арханёл Рафал найбольш вядомы па біблейскай «Кнізе Тавіта». Там ён з'яўляецца ў чалавечым абліччы, бярэ сабе звычайнае імя Азарыя і дапамагае маладому Товію ў падарожжы па срэбра, якое яго бацька Тавіт (набожны іудзей, які ў VIII ст., падчас выгнання габрэяў у Асірыю, жыў разам з сям'ёй у Ніневіі) аддаў на захаванне ў іншы горад. Па дарозе яны злавілі рыбу, жоўць якой павінна была вылечыць вочы Тавіта, а Рафал яшчэ праганяе злога духа ад Сары, дачкі Рагуіла, і аддае яе ў жонкі Товію. На абразе з Камянецкага раёна Брэсцкай вобл. *(іл. 8)*, што захоўваецца ў Музеі старажытнабеларускай культуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (МСБК), якраз адлюстраваны момант вяртання з падарожжа. У пакоі на крэсле сядзіць сляпы Тавіт, а перад ім стаяць з падарожнымі посахамі Товій і Рафал. Товій у правай руцэ трымае рыбу, а арханёл – шклянку з жоўцю для вылячэння слепаты. Унізе сядзіць сабачка, які вандраваў разам з імі. На двух абразах – з г. Іванава Брэсцкай вобл. (пачатак 19 ст., палатно, алей, 67 х 46) і з Астравецкага раёна Гродзенскай вобл. *(іл. 9)* – арханёл Рафал выступае ў ролі анёла-ахоўніка. Левай рукой ён трымае за ручку маленькае дзіця, а пад-



*Іл. 9. Арханёл Рафал з дзіцем. Астравецкі раён Гродзенскай вобл. XIX ст. Метал, алей, 70 x 40*

нятай правай паказвае на небёсы. Падобная кампазіцыя сустракаецца ў заходняўрапейскіх мастакоў XVII ст. У рэдкіх выпадках, зафіксаваных у Брэсцкай вобл., роставая выява арханёла Рафала змяшчаецца на бакавых дзвярах іканастаса. У руках ён можа трымаць чашу, срыначку з лекамі ці стужку з надпісам.

Святы вялікапакутнік Себасціян, згодна жыццеапісання, нарадзіўся ў г. Нарбоне ў Галіі і быў начальнікам прэтарыянскай гвардыі пры імператары Дыёклетыяне (III ст.). Себасціян быў хрысціянінам і за свае выказванні ў падтрымку хрысціянства быў працяты стрэламі. Аднак ён не памёр, маладая ўдава Ірына забрала яго і вылечыла. Сябры ўгаворвалі Себасціяна, штоб той уцёк з Рыма, але ён не паслухаў і пайшоў да імператара з новымі доказамі сваёй веры, за што быў забіты камянямі да смерці. Памяць святога шануецца ў каталіцкай царкве 20 студзеня, у праваслаўнай – 18 снежня. Карціны з вобразам св. Себасціяна стваралі шмат мастакоў, пачынаючы з V ст. Аднак на Беларусі падчас экспедыцыйных даследаванняў зафіксаваны толькі адзін абраз з гэтым *сюжэтам* (іл. 10), які знаходзіцца ў касцёле г. Пінска Брэсцкай вобл. Паясная выява св. Себасціяна ў набедранай павязцы, працятага стрэламі, дыяганальна размешчана на цёмным фоне абраза. Кантрастнае асвятленне рэльефна падкрэслівае фактуру цела. Галава адкінута назад, яго рукі – паднятая і адведзеная ўбок правая і апушчаная паўсагнутая левая – утвараюць другую, ураўнаважваючую дыяганаль. Мастаку ўдалося стварыць кульмінацыйны момант перадсмяротнага стану святога. Кампазіцыя абраза не мае прамых аналагаў у заходнееўрапейскім мастацтве, хаця верагодна, што аўтар падчас працы абапіраўся на творы некаторых мастакоў XVII ст.

Святы Бернард Клервоскі – французскі сярэдневечны багаслоў, містык, цыстэрцыянскі манах, абат манастыра Клерво. Нарадзіўся ў 1090 г. ў сям'і бургундскага двараніна. Пад уздзеяннем маці ў 20-гадовым узросце разам з чатырма братамі і 25 сябрамі ўступіў у кляштар манахаў цыстэрцыянцаў у Сіто, дзе набыў вядомасць



*Іл. 10. Вялікапакутнік Себасціян. Г. Пінск Брэсцкай вобл. Пачатак XIX ст. Палатно, алей, 135 x 95*

сваім падзвіжніцтвам. У 1115 г. Бернард заснаваў манастыр у Шампані, у мястэчку Клерво, дзе стаў абатам і прабыў ім да самай смерці. Дзякуючы яго дзейнасці цыстэрцыянскі ордэн стаў адным з найбуйнейшых і ў памяць святога атрымаў назву бернардзінцаў. Бернард Клервоскі змагаўся з ерасямі і вальнадумствам, ўдзельнічаў у стварэнні духоўна-рыцарскага ордэна тампліераў, а таксама быў натхняльнікам другога Крыжовага пахода 1147 г. Памёр Бернард Клервоскі 20 жніўня 1153 г. у Клерво. Кананізаваны ў 1170 г. папай Аляксандрам III, у 1830 г. унесены ў лік Настаўнікаў Царквы. У Дыжоне, на плошчы, што носіць імя святога, знаходзіцца помнік Бернарду Клервоскаму. Ён лічыцца апекуном півавараў, пчалаводаў, вытворцаў воска і свечак. Памяць святога адмячаецца 20 жніўня па грыгарыянскім календары.

На абразе з г. Мазыра Гомельскай вобл., што захоўваецца ў зборах МСБК *(іл. 11)*, прадстаўлена ўкленчаная фігура св. Бернарда ў белым аблачэнні цыстэрцыянскага ордэна, з невялікай сівой барадой і вусамі і з танзурай на галаве. Яго позірк скіраваны ўверх на нябёсы, правая рука прыціснута да грудзей. Левай рукой святы трымае вялікі крыж разам з прыладамі пакут і смерці Хрыста – кап'ём, скуранай плёткай і пучком калючых галінак, як указанне на яго асноўную багаслоўскую працу «Роздумы». З правага боку абраза змешчаны каменны слуп з вяроўкай, да якога быў прывязаны Хрыстос, і раскіданыя срэбныя манеты. З левага боку знаходзіцца пчаліны вулей, адзін з атрыбутаў святога, – намёк на «салодкасць» яго казанняў, паколькі Бернарда называлі «Мёдатачывым лекарам». У верхняй частцы абраза двое херувімаў паасобна трымаюць у руках плат Веранікі і цярновы вянок разам з трысняговай сцяблінай. Яшчэ адзін херувім абапіраецца рукой на верхавіну крыжа са штандарам, дзе на габрэйскай, грэцкай і лацінскай мовах прыведзены надпіс: «Езус Назарэй Цар Іудзейскі». Кампазіцыя абраза мае аналогіі з гравюрамі заходнееўрапейскіх мастакоў XVI ст. У Ваўкавыскім раёне Гродзенскай вобл. знаходзіцца яшчэ адзін абраз з вобразам св. Бернарда, створаны на метале



*Іл. 11. Святы Бернард Клервоскі. Мазыр Гомельскай вобл. Сярэдзіна XVIII ст. Дрэва, алей, 185 х 130*

ў XIX ст., але, на жаль, перапісаны ў 20 ст. Паясная выява святога прадстаўлена на фоне манастыра, яго рукі малітоўна прыціснуты да грудзей, позірк скіраваны на ўкрыжаванага Хрыста. Унізе змешчана мітра, яшчэ адзін атрыбут св. Бернарда, што сімвалізуе яго адказ (тройчы) ад епіскапства.

Каталіцкі святы Ян Кенцкі (Ян Вацэнга), святар, нарадзіўся 23 чэрвеня 1390 г. у польскім горадзе Кенты. У 1418 г. ён скончыў кракаўскую акадэмію са ступенню магістра філасофіі. З 1421 па 1929 г. кіраваў школай пры кляштары канонікаў у г. Мехуве непадалёку ад Кракава, потым стаў выкладчыкам філасофіі і тэалогіі ў кракаўскай акадэміі. Ян Кенцкі быў добрым прамоўцам, вылучаўся сваёй набожнасцю і міласэрнасцю. Ён добра ставіўся да студэнтаў, многіх падтрымоўваў матэрыяльна і даваў прытулак у сваім доме. Памёр у 1473 г. у Кракаве. Святы Ян Кенцкі аб'яўлены святым апекуном Польшчы і Літвы папам Кліментам XII ў 1737 г., а ў 1767 г. кананізаваны папам Кліментам XIII. Ён таксама лічыцца апекуном студэнтаў і выкладчыкаў, памяць святога шануецца 23 снежня.

На адзіным абразе з Пружанскага раёна Брэсцкай вобл. *(іл. 12)* прадстаўлены цуд св. Яна Кенцкага. Кампазіцыя абраза з'яўляецца дакладнай копіяй з твора польскага і італьянскага мастака Тадэуша Кунтцэ (1727–1793), які быў створаны ў 1765 г. і ў наш час знаходзіцца ў зборах Нацыянальнага музея Варшавы [11]. Абраз больш успрымаецца як твор жанравага жывапісу, паколькі падзея адбываецца на падворку шляхціча. У цэнтры кампазіцыі прадстаўлена выява святога Яна ў прафесарскай мантыі. Абодвума рукамі ён трымае на стале разбіты збан, з якога выцякаюць апошнія кроплі малака. На пярэднім плане, перад сталом, знаходзіцца ўкленчаная басаном служанка, апранутая ў стылізаваны народны касцюм – андарак, кофтачку з выразам на плячах і камізэльку. У правай руцэ яна трымае адбіты кавалак збана і з адчаем глядзіць на святога. За падзеяй з цікаўнасцю назіраюць сам шляхціч (у чырвоным жупане і з шабляй на поясе) і двое яго дзяцей, а таксама



*Іл. 12. Цуд св. Яна Кенцкага. Пружанскі раён Брэсцкай вобл. Канец 18 – пачатак XIX ст. Палатно, алей, 160 х 95*

трое анёлкаў-пуці ў верхняй частцы абраза. Згодна падання, Ян Кенцкі выратаваў дзяўчыну, паколькі дзякуючы яго малітве разбіты збан цудадзейным чынам зноў стаў цэлым.

Амаль усе прадстаўленыя выявы святых і пакутнікаў адпавядаюць іканаграфічнаму канону – гэта франтальныя роставыя ці паясныя адлюстраванні. У руках яны трымаюць сімвалы пакутніцтва – крыжы і пальмавыя сцяблінны, ці скруткі з надпісамі і кнігі. Часам сустракаюцца жыційныя сцэны з пакутамі святых, асобныя сюжэты створаны пад уплывам твораў заходнееўрапейскага мастацтва, аднак са сваімі іканаграфічнымі асаблівасцямі.

У адзінкавых выпадках абразы з'яўляюцца дакладнымі копіямі з карцін вядомых мастакоў.

1. Карэлін У. Р., Мельнікаў М. П. Рэдкія сюжэты ў іканапісу Беларусі // Історія релігій в Україні: наук. щорічн. Львів, 2015. Кн. 2. С. 335–350.

2. Карэлін У. Р., Мельнікаў М. П. Рэдкія сюжэты ў іканапісу Беларусі // Історія релігій в Україні: наук. щорічн. Львів, 2016. Ч. 2. С. 486–497.

3. Карэлін У. Р., Мельнікаў М. П. Рэдкія сюжэты ў іканапісу Беларусі // Історія релігій в Україні: наук. щорічн. Львів, 2017. Ч. 2. С. 152–163.

4. Католическая энциклопедия. Москва: Изд-во Францисканцев, 2002. Т. 1. 1906 с.; 2007. Т. III. 1910 с.; 2011. Т. IV. 1962 с.; 2013. Т. V. 934 с.

5. Холл Д. Словарь сюжетов и символов в искусстве. Москва, 1996. 656 с.

6. Питирим епископ Тамбовский. URL: https://ru.wikipedia.org/wiki.

7. Павел I архиепископ Константинопольский. URL: https://ru.wikipedia.org/wiki.

8. Пелагия Тарсийская. URL: https://ru.wikipedia.org/wiki.

9. Платонида Сирская. URL: http://idrp.ru/zhitiya-svyatih-lib382/.

10. Святой великомученик Прокопий Кесарийский. URL: http://www.pravoslavie.ru/54956.html.

11. Тадэуш Кунтцэ-Коніц. Цуд св. Яна Кенцкага. URL: http://artyzm.com/e_obraz.php?id=1462.